**УДК [94 + 355.425.4] (476 +474.3 + 474.4)«1941/1944»**

# ПАРТЫЗАНСКІЯ ЗОНЫ БЕЛАРУСІ ЯК ПЛАЦДАРМ ДЛЯ РАЗГОРТВАННЯ ЎЗБРОЕНАГА АНТЫГЕРМАНСКАГА СУПРАЦІЎЛЕННЯ НА ТЭРЫТОРЫІ ЛАТВІІ І ЛІТВЫ (1941–1944): АРГАНІЗАЦЫЙНЫ І БАЯВЫ АСПЕКТ

***канд. гіс. навук, дац. А.А. КРЫВАРОТ***
***(Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск)***
***tak_tav@tut.by***

*Разгледжана пытанне разгортвання партызанскага руху на беларуска-латвійскім і беларуска-літоўскім памежжы. Адзначана, што развіццё антыгерманскага супраціўлення ў 1941–1944 гг. на тэрыторыі прыбалтыйскіх рэспублік у значнай ступені было абумоўлена станам партызанскіх сіл на поўначы Віцебскай і паўночным захадзе Вілейскай абласцей. Раскрыта роля Віцебскіх «варот», Расонска-Асвейскай, Суражскай, Барысаўска-Бягомльскай і Ушачскай партызанскіх зон у прыёме, функцыянальнай падрыхтоўцы і матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні арганізатарскіх і баявых груп, якія накіроўваліся з савецкага тылу для далейшай баявой дзейнасці ў Літве і Латвіі. Абазначаны месцы базіравання на тэрыторыі Беларусі аператыўных груп ЦК КП(б) Латвіі і ЦК КП(б) Літвы, асноўныя раёны дыслакацыі латышскіх і літоўскіх партызанскіх падраздзяленняў. Прыведзены прыклады сумесных баявых аперацый партызан Беларусі, Латвіі і Літвы на транспартных камунікацыях праціўніка і супраць яго гарнізонаў. Матэрыял падрыхтаваны на аснове аналізу навуковай літаратуры і дакументаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь.*

***Ключавыя словы:*** *Аператыўная група, гарнізон, дыверсія, камунікацыі, карная аперацыя, партызанская зона, партызанскі атрад, плацдарм, рэйд.*

**Уводзіны**. Ва ўмовах хуткага наступлення войск вермахта большасць партыйна-савецкага актыву Латвіі і Літвы летам 1941 г. адышла на ўсход разам з войскамі Чырвонай Арміі. Партызанскія падраздзяленні, пакінутыя ў тыле ворага, змаглі ў ліпені – верасні 1941 г. правесці некалькі нападаў на акупацыйныя аб'екты, аднак пасля першых баёў з карнымі камандамі многія з іх былі рассеяны, панеслі страты, а байцы, якія засталіся жывыя, перайшлі да падпольных метадаў змагання. З набліжэннем зімы 1941/1942 г. большасць груп, закінутых з-за франтавой паласы па лініі партыйных органаў, камандавання Паўночна-Заходняга фронту і Балтыйскага флоту, ва ўмовах жорсткага пераследу з боку акупантаў ці спынілі ўзброеную барацьбу, ці вярнуліся праз лінію фронту ў савецкі тыл. Некаторыя партызанскія арганізатары часова перайшлі ў лясы Беларусі і Расійскай Федэрацыі, дзе былі ўключаны ў склад мясцовых атрадаў. Разгортванне партызанскай барацьбы ўскладняла і тое, што ў Латвіі і Літве савецкая ўлада існавала кароткі час. Недастаткова быў згуртаваны партыйна-савецкі актыў, а значная частка насельніцтва ў гарадах і сельскай мясцовасці па першым часе падтрымала нямецкі рэжым. У выніку арганізацыйны перыяд фарміравання партызанскага руху і стварэння адзінага кіруючага цэнтра антыгерманскага змагання ў Латвіі і Літве зацягнуўся. Пачынаючы з вясны 1942 г. Масква стала разглядаць некаторыя раёны Беларусі, вызваленыя партызанамі ад праціўніка, у якасці плацдарма для канцэнтрацыі латышскіх і літоўскіх арганізатарскіх груп і партызанскіх падраздзяленняў з мэтай іх далейшага пранікнення на тэрыторыю прыбалтыйскіх рэспублік і разгортвання там узброенага антыгерманскага супраціўлення.

Некаторая інфармацыя аб узаемадзеянні партыйных органаў, партызанскіх фарміраванняў і падпольных груп Беларусі, Латвіі і Літвы ў справе арганізацыі барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ўтрымліваецца ў калектыўных навуковых працах [1; 2; 4; 6], манаграфіях [8; 11; 15], у навуковых артыкулах [9; 13], разнастайных зборніках [3; 5; 7; 12], навукова-папулярных брашурах [10; 14].

Разам з гэтым, нягледзячы на прысутнасць у публікацыях пэўных звестак аб арганізацыйных і баявых кантактах савецкіх патрыётаў Беларусі, Латвіі і Літвы ў гады Вялікай Айчыннай вайны, у гістарыяграфіі яшчэ адсутнічае комлексная навуковая праца, дзе ўсебакова быў бы асветлены ўклад партыйных структур КП(б)Б, партызанскіх фарміраванняў у станаўленне і пашырэнне ўзброенай барацьбы супраць германскіх акупантаў і іх памагатых на тэрыторыі прыбалтыйскіх рэспублік.

Мэта артыкула – на аснове аналізу выяўленага матэрыялу ў навуковай літаратуры, выкарыстання архіўных дакументаў паказаць уплыў і значэнне партызанскіх зон, створаных на тэрыторыі Віцебскай, Мінскай і Вілейскай абласцей, на арганізацыйнае афармленне і баяздольнасць латышскіх і літоўскіх партызанскіх фарміраванняў, арганізацыйна-палітычную дзейнасць падпольных партыйных цэнтраў ЦК КП(б) Латвіі і Літвы.

**Асноўная частка.** Арганізацыйныя і баявыя сувязі савецкіх патрыётаў Беларусі, Латвіі і Літвы з мэтай сумеснай барацьбы супраць германскіх захопнікаў і іх памагатых зарадзіліся ў першыя месяцы Вялікай Айчыннай вайны. Яны праяўляліся ў разнастайных формах, асноўнай з якіх у 1941 – пачатку 1942 г. была ўзаемадапамога ў наладжванні падпольнай работы і партызанскага руху ў памежных раёнах. Месцам першых кантактаў беларускіх і латышскіх патрыятычных груп стаў Асвейскі раён Віцебскай вобласці. Тут напачатку зімы 1941 г. сталі ўзаемадзейнічаць падпольная група з беларускай вёскі Прошкі

ў складзе некалькіх дзясяткаў чалавек і патрыёты са Шкяўненскай і Пасіенскай валасцей Лудзенскага ўезда Латвіі на чале з А.М. Громам. Беларускія падпольшчыкі з мэтай падрыхтоўкі да разгортвання ўзброенай барацьбы супраць акупантаў стварылі непадалёку ад вёскі Прошкі тайнае сховішча зброі і боепрыпасаў, сабраных на месцах былых баёў. Гэты аб’ект стаў своеасаблівай базай, куды з Латвіі падпольшчыкі перапраўлялі байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі, савецкіх актывістаў, якім пагражала расправа з боку акупантаў. Сярод ваеннаслужачых-акружэнцаў і ваеннапалонных-уцекачоў, хто такім чынам перабраўся на тэрыторыю Беларусі, былі будучыя камандзіры 2-й Дрысенскай і Асвейскай імя М.В. Фрунзе партызанскіх брыгад, І.М. Кухарэнка і М.М. Кузьмін, камандзір атрада А.А. Шамаль. У сакавіку 1942 г. на гэту тайную базу перанеслі сваю зброю і боепрыпасы з Латвіі падпольшчыкі групы А.М. Грома [3, с. 100; 4, с. 364; 6, с. 476–477; 10, с. 11, 17–18; 11, с. 45; 14, с. 87; 15, с. 254–255; 16, с. 38–44; 17, с. 278–280, 359].

Пачатак баявой садружнасці савецкіх патрыётаў Беларусі і Літвы звязаны з дзейнасцю на беларуска-літоўскім памежжы групы Ф.Р. Маркава, якая 16 верасня 1941 г. пранікла на тэрыторыю Пастаўскага раёна пасля завяршэння вучобы ў дыверсійнай школе каля Бранска. Сам Ф.Р. Маркаў быў ураджэнцам Швянчонскага раёна Літвы, удзельнічаў у рэвалюцыйным руху на тэрыторыі Заходняй Беларусі, а пасля ўз’яднання рэгіёна з БССР і да пачатку германскай акупацыі працаваў намеснікам старшыні Вілейскага аблвыканкама. За першыя месяцы знаходжання ў тыле праціўніка група змагла правесці некалькі дыверсій на чыгунцы Вільнюс – Дзвінск. На баявым рахунку падраздзялення – крушэнне воінскага эшалона з аўтатранспартам у складзе 30 вагонаў, падрыў эшалона з прадуктамі і фуражом для нямецкіх франтавых часцей, скінутыя пад адхон шэсць паравозаў. Найбольш эфектыўны ўдар па чыгунцы быў нанесены 6 студзеня 1942 г., калі на ўчастку паміж станцыямі Падброддзе і Пагулянка быў разбіты паравоз, 39 вагонаў, забіта і паранена 185 нямецкіх салдат і афіцэраў. У асноўным баявая дзейнасць групы распаўсюджвалася на беларуска-літоўскае памежжа. Зімой 1941/1942 г. партызанам групы Ф.Р. Маркава ўдалося прасачыцца ў Вільнюс і ўсталяваць кантакты з савецкімі патрыётамі з ліку мясцовых актывістаў і ваеннаслужачых. З першых месяцаў вайны не толькі Віцебская, але і Вілейская вобласць стала той базай, дзе знаходзілі сабе прытулак афіцэры і салдаты Чырвонай Арміі, якія трапілі ў акружэнне ці германскі палон на тэрыторыі прыбалтыйскіх рэспублік. Так, у 1941 г. члены антыфашысцкай падпольнай арганізацыі з Панявежскага ўезда перапраўлялі ў Вілейскую вобласць савецкіх ваеннаслужачых-уцекачоў з лагераў ваеннапалонных [4, с. 360; 7, с. 276; 15, с. 256; 18, лл. 155, 156].

Вясной 1942 г. партызанскі рух на тэрыторыі Віцебскай вобласці, у тым ліку на мяжы з Латвіяй, стаў паступова набываць масавы характар. Гэта тлумачыцца наступнымі падзеямі. Па-першае, з лютага 1942 г. сталі функцыянаваць Віцебскія (Суражскія) «вароты», праз якія на акупаваную тэрыторыю сталі накіроўвацца атрады, арганізатарскія і баявыя групы, перапраўляцца зброя і боепрыпасы. Па-другое, мясцовыя падпольныя групы сталі аб’ядноўвацца і пераходзіць да партызанскіх метадаў барацьбы. Па-трэцяе, да партызанскай дзейнасці сталі далучацца ваеннаслужачыя, якія даволі часта аказвалі станоўчы ўплыў на баяздольнасць і арганізаванасць партызанскіх баявых адзінак. Па-чацвёртае, даволі хуткі рост колькасці атрадаў спрыяў узбуйненню партызанскіх сіл – арганізацыі брыгад.

Разгортванне партызанскіх сіл у непасрэднай блізкасці ад тэрыторыі Латвіі мела важнае значэнне для актывізацыі барацьбы савецкіх патрыётаў гэтай прыбалтыйскай рэспублікі, якія сталі шукаць кантакты з беларускімі партызанамі. У канцы сакавіка 1942 г. з-за пагрозы для моладзі германскай мабілізацыі група А.М. Грома («атрад смалакураў») колькасцю 25 байцоў перайшла да партызанскай дзейнасці, а ў маі перабралася з Лудзенскага ўезда ў лясы Асвейскага раёна і стала часткай мясцовага атрада пад камандаваннем І.К. Захарава. Падраздзяленне афармілася ў канцы красавіка 1942 г. і складалася з мясцовых актывістаў і ваеннаслужачых-акружэнцаў. Прыкладна ў гэты час пасля правядзення буйной дыверсіі – падрыву склада – у беларускі атрад прыбыў адзін з кіраўнікоў падпольнай арганізацыі Дзвінска, А. Максімаў, а некалькі пазней – удзельнік абароны Ліепаі, кіраўнік адной з рыжскіх падпольных груп, І. Судмаліс. У пачатку лета 1942 г. амаль палову Асвейскага атрада складалі латышы. У складзе беларускага атрада байцы групы А.М. Грома і іншыя латышскія падпольшчыкі дзейнічалі як самастойнае падраздзяленне [2, с. 398; 3, с. 182; 4, с. 364; 5, с. 234; 6, с. 476–477, 10, с. 35; 11, с. 46; 14, с. 88; 15, с. 254–255; 19, лл. 2, 9].

У сумесных аперацыях з атрадам І.К. Захарава супраць германскіх акупантаў і іх памагатых латышскія партызаны набывалі неабходны баявы вопыт. Вясной – летам 1942 г. ва ўзаемадзеянні былі нанесены ўдары па калонах ворага на шашэйных камунікацыях, здзейснены напады на апорныя пункты акупантаў у Асвейскім раёне і Латвіі. На баявым рахунку партызан тры ўдалыя напады на праціўніка з засады на шашы Коханава – Асвея, у выніку якіх былі разбіты шэсць машын, у тым ліку легкавая, знішчаны каля 40 салдат і афіцэраў, у тым ліку генерал, здабыты важныя дакументы і іншыя трафеі. Падчас гэтых дыверсій вызначыўся баец атрада латыш І. Судмаліс. У маі 1942 г. партызаны вызвалілі значную частку Асвейскага раёна, разбурылі масты на дарогах, што вялі на Себеж і Дрысу. Народныя мсціўцы не абмяжоўваліся правядзеннем аперацый на беларускай тэрыторыі, а здзяйснялі ўдары па аб’ектах акупацыйнага рэжыму ў памежных уездах Латвіі. Так, 12 чэрвеня 1942 г. атрадамі імя М.В. Фрунзе Асвейскага раёна, Сяргееўскім Расонскага раёна (камандзір С.Х. Каракін) і падраздзяленнем Калінінскай вобласці агульнай колькасцю да 200 байцоў

было атакавана мястэчка Шкяуне, дзе размяшчаліся нямецкія акупацыйныя ўстановы і гарнізон, адкуль немцы і айзсаргі рабілі вылазкі супраць партызан і набегі на навакольныя вёскі. Партызаны забілі і паранілі дзясяткі акупантаў з ліку аховы населенага пункта, ліквідавалі нямецкі пагранічны атрад, разграмілі валасную ўправу, казарму, пошту, тэлефонную станцыю. Нападаўшыя знішчылі рэгістрацыйныя спісы мясцовай моладзі, чым сарвалі яе адпраўку ў Германію. Налётам на акупацыйны аб'ект атрады сур'ёзна падарвалі харчовую базу праціўніка ў рэгіёне, забраўшы са складоў каля трох тон мукі, цукру, масла. Паспяховаму правядзенню аперацыі ў значнай ступені садзейнічалі разведдадзеныя аб праціўніку, здабытыя напярэдадні латышскай групай А.М. Грома. Значнай баявой падзеяй у гісторыі атрада імя М.В. Фрунзе стаў напад у ноч з 20 на 21 чэрвеня 1942 г. на райцэнтр Асвея, пасля чаго дзясяткі жыхароў з навакольных вёсак уключыліся ў савецкі партызанскі рух. На тэрыторыі суседняга Расонскага раёна наносіла ўдары па акупантах падраздзяленне пад камандаваннем Р.А. Ахоціна, якое толькі за май 1942 г. разграміла паліцэйскія ўчасткі і ўправы на тэрыторыі 10 сельсаветаў, а таксама атрады Сяргееўскі (камандзір С.Х. Каракін) і Антоненкі. Вызваленая ад праціўніка тэрыторыя раёнаў паклала пачатак Расонска-Асвейскай партызанскай зоне, якая даходзіла да граніц Латвіі і Літвы [2, с. 402–403; 6, с. 477; 10, с. 35–36; 11, с. 46; 16, с. 109–113; 19, лл. 4, 9–10; 20, л. 15].

Актыўная баявая дзейнасць партызан на поўначы Віцебскай вобласці вясной – летам 1942 г. спрыяла пастаяннаму прытоку ў атрады новых байцоў. У сярэдзіне ліпеня 1942 г. атрад І.К. Захарава налічваў 150 чалавек, а ў жніўні 1942 г. на яго базе былі сфарміраваны тры новыя атрады. Важны этап пашырэння і ўмацавання партызанскага руху на поўначы Віцебшчыны быў звязаны с прыбыццём у рэгіён 1 ліпеня 1942 г. спецпадраздзялення Ваеннага савета 29-й арміі пад № 17 (камандзір А.І. Петракоў). Пасля некалькіх этапаў рэарганізацыі з атрадаў, якія дыслацыраваліся на тэрыторыі Асвейскага, Дрысенскага і Расонскага раёнаў, па распараджэнні аператыўнай групы партызанскага руху пры Ваенным савеце 4-й ударнай арміі ад 26 жніўня 1942 г. былі вызначаны чатыры брыгады. Узбуйненне партызанскіх сіл рэгіёна дазволіла народным мсціўцам наносіць адчувальныя ўдары па чыгуначных і важных шашэйных камунікацыях, буйных апорных пунктах ворага. Сведчаннем узрослага баявога патэнцыялу партызан стаў паспяховы падрыў атрадамі Асвейскага, Дрысенскага, Расонскага раёнаў 110-мятровага чыгуначнага моста праз Дрысу, вызваленне ад акупантаў у верасні 1942 г. населенага пункта Коханавічы, які размяшчаўся на скрыжаванні важных дарог і на шляху партызан да чыгункі, а таксама выгнанне акупантаў з райцэнтраў Асвея і Расоны. Такім чынам, у пачатку восені 1942 г. партызаны Расонска-Асвейскай зоны па сваёй арганізацыйнай структуры і баявых магчымасцях уяўлялі грозную сілу [19, л. 9–10; 20, л. 39; 21, л. 12–13, 35; 22, л. 13].

У заходняй частцы Расонска-Асвейскай зоны былі створаны трывалыя ўмовы для засылкі на тэрыторыю суседняй прыбалтыйскай рэспублікі партызанскіх і падпольных груп. Наяўнасць такой магчымасці была вельмі важная яшчэ з прычыны таго, што падчас свайго рэйду з Ленінградскага партызанскага краю партызанскі полк «За Савецкую Латвію» з 20 чэрвеня па 10 ліпеня 1942 г. не змог замацавацца на латвійскай тэрыторыі, стварыць там цэнтры партызанскага руху і агульны кіруючы цэнтр антыгерманскага супраціўлення. З усіх падраздзяленняў палка праз кальцо праціўніка ўглыб Латвіі прарваліся тры невялікія групы колькасцю 20 чалавек. У канцы ліпеня 1942 г. яны злучыліся ў лесе на стыку граніц Валкскага і Абрэнскага ўездаў, дзе стварылі невялікі партызанскі атрад (камандзір В. Эзерніек). Акрамя таго, у жніўні – верасні 1942 г. паветраным шляхам і праз акупаваную тэрыторыю Калінінскай і Ленінградскай абласцей у латвійскія рэгіёны было закінута яшчэ некалькі атрадаў і груп, якія з прычыны нападаў буйных карных каманд былі вымушаны перайсці ў глыбокае падполле ці вярнуцца ў савецкі тыл [10, с. 41–64; 11, с. 55, 57–58, 69].

Разгортванне партызанскага руху на тэрыторыі Літвы ў першай палове 1942 г. мела істотныя цяжкасці, абумоўленыя слабасцю падпольных і партызанскіх структур як у самой прыбалтыйскай рэспубліцы, так і ў сумежных раёнах Беларусі. Спробы стварыць кіраўнічы цэнтр па антыгерманскім супраціўленні ў Літве праз засылку туды арганізацыйных і баявых груп паветраным шляхам не прынёс станоўчых вынікаў. Так, у сакавіку 1942 г. у тыл праціўніка былі закінуты самалётамі дзве вялікія групы кіраўнічых партыйных і камсамольскіх работнікаў на чале з сакратаром ЦК КП(б) Літвы І. Мескупасам-Адомасам, якім удалося распачаць сваю дзейнасць у паўночнай і паўднёвай частках рэспублікі. Аднак у хуткім часе групы перасталі выходзіць на сувязь з Цэнтрам і амаль поўнасцю загінулі. Летам 1942 г. на тэрыторыю рэспублікі было закінута яшчэ сем груп арганізатараў партызанскага руху. Адначасова ЦК КП(б) Літвы з мэтай засылкі новых груп на тэрыторыю рэспублікі ў сярэдзіне 1942 г. звярнуўся да ЦК КП(б)Б з просьбай прыцягнуць беларускіх партызан да аказання дапамогі літоўскім баявым і арганізатарскім групам у пранікненні на вызначаныя рэгіёны рэспублікі для выканання пастаўленых задач. Беларускі бок станоўча аднёсся да такой просьбы. Сакратар ЦК КП(б)Б Р.Б. Эйдзінаў арыентаваў Паўночна-Заходнюю аператыўную групу ЦК КП(б)Б на аказанне патрыётам суседняй рэспублікі дапамогі праваднікамі і ўсталяваннем сувязі з брыгадамі Віцебскай вобласці на чале з А.Я. Марчанка і М.І. Дзячковым, праз месца дыслакацыі якіх пралягаў маршрут літоўскіх партызан. Найбольшая колькасць арганізатарскіх і баявых груп прайшла праз Віцебскія «вароты», да якіх прымыкала Суражская партызанская зона. Першыя два літоўскія падраздзяленні разам з інструктарам ЦК КП(б) Літвы, С. Сырусам, пры ўдзеле Паўночна-

Заходняй аператыўнай групы ЦК КП(б)Б пераправіліся праз разрыў у лініі фронту летам 1942 г. [1, с. 297, 310; 6, с. 478; 12, с. 609–608; 13, с.46, 51; 14, с. 100–101].

Для ўмацавання партызанскіх сіл у паўночнай частцы Вілейшчыны, як важнага плацдарма для пераходу арганізатарскіх і баявых груп у суседнюю рэспубліку, у жніўні 1942 г. у рэгіён па распараджэнні ЦШПР і штаба 4-й ударнай арміі Калінінскага фронту быў накіраваны атрад пад камандаваннем І.І. Пятрова (пазней – атрад «Спартак»), вылучаны са складу 2-й Беларускай брыгады (камандзір М.І. Дзячкоў). Некалькі пазней з-за лініі фронта праз Віцебскія «вароты» ў Вілейскую вобласць пранiклi пяць груп літоўскіх партызан. Яны былі добра ўзброены і мелі радыёстанцыю для сувязі з Цэнтрам. Пасля кароткага адпачынку ў казянскіх лясах тры літоўскія групы перабраліся ў Літву, а падраздзяленні Й. Арлаўскаса і Дубаўскаса аб'ядналіся ў адзін атрад, у якім першы стаў камандзірам, а другі – камісарам. Пасля праведзенай сумесна беларускімі і літоўскімі групамі разведкі ў шэрагу рэгіёнаў Літвы было вызначана, што там яшчэ не мелася неабходных умоў для базіравання буйнога партызанскага фарміравання. У такой сітуацыі камандаванне літоўскага атрада прыняло рашэнне заставацца на тэрыторыі Вілейшчыны да вясны 1943 г. і разам з мясцовымі партызанамі ўдзельнічаць ва ўзброенай барацьбе супраць германскіх акупантаў і іх паслугачоў [14, с. 100; 18, лл. 144, 159, 172аб. ; 23, с. 169–170; 24, л. 289].

Першыя захады па выкарыстанні беларускай тэрыторыі як плацдарма для разгортвання партызанскага руху ў Латвіі былі зроблены ў верасні 1942 г., калі ў Асвейскі раён па заданні ЦК КП(б) Латвіі і пры садзеянні беларускага кіраўніцтва праз лінію фронту прыбылі тры групы (кіраўнікі Х. Грысліс, А. Лапа, І. Бараноўскі). Пасля непрацяглай падрыхтоўкі латышскія групы пры дапамозе беларускіх партызан перадыслацыраваліся ў раёны, вызначаныя ЦК КП(б) Латвіі, і разгарнулі там баявую дзейнасць. Падраздзяленне Х. Грысліса ў раёне г. Карсава ў лістападзе 1942 г. падверглася нападу карнікаў, панесла адчувальныя страты і было рассеяна. Двум байцам удалося заканспіравацца і звязацца з падпольшчыкамі. Група А. Лапы ў раёне гулбенскіх лясоў была акружана і ў баі з карнікамі страціла большую частку свайго асабовага складу. Тры байцы звязаліся з іншымі патрыятычнымі адзінкамі і працягнулі далейшае змаганне з гітлераўцамі [4, с. 364; 10, с. 69–71; 11, с. 76; 14, с. 90].

З рэйдавых латышскіх падраздзяленняў найбольш эфектыўна дзейнічала група І. Бараноўскага, што атрымала задачу аперыраваць у паўднёва-заходняй частцы Латвіі. Баявыя аперацыі група праводзіла на поўначы Вілейшчыны сумесна з беларускім атрадам «Спартак», які, у сваю чаргу, узаемадзейнічаў з літоўскім атрадам Й. Арлаўскаса. Беларускія, латышскія і літоўскія партызаны за верасень – лістапад 1942 г. правялі да 15 нападаў на гарнізоны, участкі і валасныя ўправы праціўніка, у тым ліку ў Вопсе, Ёдах, Казянах. Найбольш маштабнай стала аперацыя з удзелам трох падраздзяленняў супраць паліцэйскай каманды колькасцю 130 чалавек, з дапамогай якой планавалі аднавіць гарнізон у Казянах з мэтай абароны акупацыйных аб'ектаў, у тым ліку маста праз Дзісну. У выніку раптоўнага нападу на мястэчка ў ноч з 3 на 4 лістапада 1942 г. партызаны знішчылі нямецкага афіцэра і дзясяткі паліцэйскіх, узялі ў палон 18 акупантаў, захапілі зброю і боепрыпасы. Пасля паспяховай аперацыі пачаўся прыток у атрады мясцовай моладзі. Разам з нападамі на гарнізоны партызаны ажыццяўлялі ўдары па варожых камунікацыях. Байцы групы І. Бараноўскага 30 кастрычніка 1942 г. скінулі пад адхон воінскі эшалон з гітлераўцамі на 12-м кіламетры чыгункі Вільнюс – Дзвінск. Атрады «Спартак» і Й. Арлаўскаса разбурылі чыгуначнае палатно на ўчастку Полацк – Вільнюс, рух на якім акупантам так і не ўдалося аднавіць. Ужо пасля першых аперацый партызан акупацыйнае камандаванне стала рабіць захады па падаўленні баявой актыўнасці атрадаў. Так, 22 кастрычніка 1942 г. карная групіроўка ў складзе 70 выпускнікоў унтэр-афіцэрскай школы, 79 літоўскіх, латышскіх і беларускіх паліцаяў напала на лагер партызан у лесе каля вёскі Возерава. Дзякуючы граматна арганізаванай абароне партызанскія сілы колькасцю да 50 чалавек па выніках гадзіннага бою нанеслі карнікам адчувальныя страты і прымусілі адступіць. На левым флангзе партызанскай абароны дзейнічаў літоўскі атрад на чале з Й. Арлаўскасам. Сярод захопленых партызанамі трафеяў былі кулямёт, шэсць аўтаматаў, 21 вінтоўка, 13 пісталетаў, 5 ракетніц, 40 гранат і 2500 патронаў [1, с. 311; 4, с. 362; 14, с. 100; 23, с. 170; 24, лл. 12, 18аб., 311, 313аб.].

Нягледзячы на актыўную баявую дзейнасць, тром партызанскім падраздзяленням не ўдалося замацавацца на поўначы Вілейшчыны і ўтрымаць плацдарм, абапіраючыся на які літоўскія арганізацыйныя і баявыя групы маглі б пранікаць на тэрыторыю прыбалтыйскай рэспублікі. У выніку буйной карнай аперацыі 22–24 лістапада 1942 г. з гарнізонаў Браслаў, Відзы, Глыбокае, Казяны, Шаркаўшчына праціўнік сіламі да 5 тысяч нямецкіх ваеннаслужачых і паліцыі пры падтрымцы 6 танкаў, 2 бронемашын, артылерыі і мінамётаў пасля непрацяглага бою змог акружыць беларускіх, латышскіх і літоўскіх партызан. У такой крытычнай сітуацыі атрады для змяншэння страт невялікімі групамі з баямі прарваліся з блакады ў напрамку Шаркаўшчыны. Адна частка атрада «Спартак» колькасцю 114 байцоў перабралася ў Расонскі раён, другая колькасцю 70 чалавек апынулася ва Ушачскім раёне. Некалькі невялікіх груп засталіся ў казянскіх лясах. Атрад Й. Арлаўскаса пасля выхаду з баёў перайшоў на тэрыторыю Літвы. За два месяцы знаходжання на Вілейшчыне літоўскае падраздзяленне пры дапамозе атрада «Спартак» умацавалася арганізацыйна і ў баях з германскімі акупантамі набыло неабходны баявы вопыт [14, с. 101; 24, лл. 12аб., 16, 20, 314 аб.].

Пасля ліквідацыі германскімі регулярнымі часткамі Віцебскіх «варот» у канцы верасня 1942 г. тэрыторыя Віцебскай вобласці заставалася і надалей плацдармам, па якім пралягаў маршрут арганізатарскіх і баявых груп у прыбалтыйскія рэспублікі. У лістападзе 1942 г. лінію фронту непадалёку ад райцэнтра Невель Калінінскай вобласці пераадолелі пяць літоўскіх падраздзяленняў, якія месцам свайго першапачатковага базіравання выбралі Расонска-Асвейскую партызанскую зону. Адно з такіх падраздзяленняў, група «Мечыс» пад камандаваннем П.П. Пранявічуса ў складзе 40 байцоў, разам з віцебскімі, калінінскімі і латышскімі партызанамі неаднаразова ўдзельнічала ў баявых аперацыях супраць германскіх акупантаў. Яшчэ адным рэгіёнам, у якім літоўскія партызаны ў 1942 – пачатку 1943 г. базіраваліся пасля прыбыцця з Вялікай зямлі, стала Мінская вобласць. На партызанскую пляцоўку, размешчаную непадалёку ад месца дыслакацыі чэкісцкага спецатрада С.А. Ваўпшасава на тэрыторыі Чэрвеньскага раёна, у верасні 1942 г. на самалёце прыбылі дзве разведвальныя групы літоўскіх партызан «Сябры» і «Нерыс» на чале з І.І. Вільджунасам. Разведчыкі размясціліся ў зоне адказнасці брыгад «Дзядзькі Колі» (камандзір П.Р. Лапацін) і «Народныя мсціўцы» (камандзір В.Т. Варанянскі). У пачатку 1943 г. І.І. Вільджунас на тэрыторыі Барысаўскага раёна сустрэўся з камандзірам брыгады імя К.Я. Варашылава Вілейскай вобласці, Ф.Р. Маркавым. Было дамоўлена, што літоўскія групы пасля марша з тэрыторыі Мінскай вобласці на Вілейшчыну і да моманту пераходу ў суседнюю рэспубліку, будуць часова базіравацца разам з вілейскімі партызанамі. На беларускай зямлі зімой 1942/1943 г. у месцах дыслакацыі беларускіх партызан таксама размяшчаліся літоўскія атрады і групы «Вільнюс» (камандзір С. Апівала), «Дуброўскага» (камандзір П. Галубовас), «Мішкас» (камандзір В. Мічунас), «Грыгаса» і інш. [14, с. 102–103; 23, с. 177–179].

З улікам размаху партызанскага руху на тэрыторыі Віцебшчыны напрыканцы восенні 1942 г. Цэнтр стаў разглядаць беларуска-латвійскае памежжа ў Асвейскім раёне ў якасці плацдарма для разгортвання дзейнасці кіруючага органа, здольнага аб'яднаць разрозненыя савецкія патрыятычныя групы на тэрыторыі прыбалтыйскай рэспублікі і звязаць іх з ЦК КП(б) Латвіі. З гэтай мэтай у другой палове снежня 1942 г. з-за лініі фронту быў накіраваны атрад ЦК КП(б) Латвіі пад камандавннем В.П. Самсона, які стаў базіравацца ў вёсках Гнільцы і Красава Асвейскага раёна. Атрад павінен быў пранікнуць у Латвію, замацавацца там, устанавіць сувязі з патрыятычнымі групамі і стварыць умовы для дзейнасці кіруючага цэнтра антыгерманскага супраціўлення. На беларускай тэрыторыі латышскае падраздзяленне заўважна павялічылася колькасна. Да яго былі далучаны з брыгады І.К. Захарава група А.М. Грома колькасцю 35 чалавек, з атрада «Спартак» група І. Бараноўскага ў складзе 15 байцоў, а таксама некалькі дробных груп, якія засталіся ад палка «За Савецкую Латвію» пасля яго рэйду і змагаліся супраць акупантаў у брыгадах Віцебскай і Калінінскай абласцей. Дзякуючы дапамозе беларускіх партызан спецатраду В.П. Самсона ўдалося за кароткі тэрмін стварыць неабходную базу для работы аператыўнай групы ЦК КП(б) Латвіі, якая ў студзені 1943 г. прыбыла ў Асвейскі раён [4, с. 363–365; 11, с. 82, 84–85; 14, с. 91].

На новым месцы дыслакацыі атрад В.П. Самсона адразу далучыўся да баявых аперацый беларускіх і калінінскіх партызан. У пачатку студзеня 1943 г. латышскае падразделенне ўдзельнічала ў нападзе на восем варожых гарнізонаў па чыгуначнай лініі Боркавічы – Дрыса, падчас якога праціўніку быў нанесены значны ўрон. У першай аперацыі на латвійскай тэрыторыі 12 студзеня 1943 г. падраздзяленне В.П. Самсона ўзаемадзейнічала з адзінаццаццю беларускімі і калінінскім атрадамі. Партызаны агульнай колькасцю больш за 700 чалавек разграмілі ў валасным цэнтры Вецслабада гарнізон, які налічваў 69 чалавек, паліцэйскі ўчастак і валаснoe ўпраўленне, знішчылі 4 склады з харчамі. Акрамя таго, пры блакіраванні апорных пунктаў праціўніка Шкяўне, Шэшкі, Пасіене, Забор'е былі ліквідаваны 30 нямецкіх і два латышскія салдаты. Пры разгроме гарнізона ў Вецслабадзе ва ўдарную партызанскую групіроўку ўваходзілі чатыры беларускія атрады, аўтаматчыкі з латышскага падраздзялення і літоўская група П. Пранявічуса. Паспяховае правядзенне аперацыі аказала станоўчы ўплыў на дзейнасць савецкіх патрыятычных сіл у Латвіі. Пасля нападу на Вецслабаду ў латышскі спецатрад сталі актыўна ўлівацца жыхары з розных населеных пунктаў рэспублікі, у тым ліку з Рыгі, Двінска, Рэзекне, Відземе [3, с. 145; 9, с. 48; 16, с. 219; 26, лл. 127–129; 27, л. 82].

Падчас рэйдаў партызан з Асвейскага раёна на тэрыторыю Латвіі ў другой палове студзеня – першай дэкадзе лютага 1943 г былі захоплены ў палон восем пагранічнікаў Латышонкаўскага кардона, разгромлены Рундзенская валасная ўправа, паліцэйскі ўчастак і тэлефонная станцыя. Актыўнасць партызан у памежнай паласе істотна абмяжоўвала там уплыў акупацыйнай улады, стварала магчымасці савецкім патрыятычным групам для пранікнення ўглыб тэрыторыі Латвіі. Пры такім развіцці падзей германскае камандаванне прыняло дадатковыя меры па ізаляцыі тэрыторыі Латвіі ад Асвейскага і Себежскага раёнаў. Па-першае, у 30-кіламетровай паласе была разгорнута суцэльная сетка гарнізонаў і 27 дадатковых умацаваных аб'ектаў у Лудзенскім і Дзвінскім уездах з прыцягненнем 1000 ахоўнікаў пад камандаваннем нямецкіх афіцэраў. Па-другое, з мэтай ліквідацыі плацдарма для пранікнення партызан на тэрыторыю Латвіі акупацыйны рэжым правёў супраць Расонска-Асвейскай зоны дзве буйныя карныя аперацыі «Заяц-бяляк» (27.01–14.02. 1943) і «Зімовае чараўніцтва» (14.02–20.03. 1943). У цяжкіх баях з карнікамі сумесна з беларускімі і калінінскімі партызанамі ўдзельнічаў латышскі спецатрад, байцы якога падчас першай экспедыцыі мужна трымалі абарону каля вёсак Прохарава і Паўлава Расонскага раёна, а падчас другой эфектыўна дзейнічалі ў тыле карнікаў у раёне населенага пункта Шкяуне і хутара Шрамі, дзе захапілі шмат палонных і трафеі [3, с. 147–151; 7, с. 44–45; 11, с. 87–88; 14, с. 92–93; 20, л. 42–43; 22, л. 85–87; 25, л. 211; 26, л. 138–140].

Нягледзячы на складаную абстаноўку ў месцы базіравання, атрад пастаянна папаўняўся новымі байцамі коштам жыхароў розных рэгіёнаў Латвіі і Беларусі. З прычыны вялікага колькаснага складу падраздзялення, наяўнасці ў ім падрыхтаваных камандна-палітычных кадраў Латвійскі штаб партызанскага руху (начальнік А.К. Спрогіс) сваім загадам ад 23 сакавіка 1943 г. стварыў на базе спецатрада партызанскую брыгаду (камандзір В.Я. Лайвіньш). У адпаведнасці з распараджэннямі Цэнтра частка падраздзяленняў брыгады вясной – восенню 1943 г. перамясцілася з беларуска-латвійскага памежжа ўглыб тэрыторыі Латвіі для стварэння новых партызанскіх атрадаў і арганізацыйных цэнтраў. У кастрычніку 1943 г. у рэйд з асвейскіх лясоў у раён Кегума было накіравана падраздзяленне ў складзе 17 чалавек на чале з камісарам Латвійскай брыгады О.П. Ошкалнам. Байцы брыгады, якія засталіся ў раёне на поўнач ад Асвейскага возера, працягвалі разам з беларускімі партызанамі наносіць удары па камунікацыях праціўніка і ажыццяўляць напады на яго апорныя пунты [10, с. 93; 11, с. 95–96, 98, 108, 110, 120–121, 126].

У якасці аднаго з плацдармаў для збору і гуртавання літоўскіх арганізатарскіх і баявых падраздзяленняў выкарыстоўвалася тэрыторыя Барысаўска-Бягомльскай зоны, куды 21–23 сакавіка 1943 г. на транспартных самалётах з Вялікай зямлі прыбыла аператыўная група ЦК КП(б) Літвы на чале з М.Ю. Шумаўскасам. Партыйныя работнікі і байцы суправаджэння па першым часе знаходзіліся ў раёне базіравання брыгады «Жалязняк» (камандзір І.П. ЦітКоў). Пры арганізацыі сваёй дзейнасці аператыўная група ЦК КП(б) Літвы на тэрыторыі Беларусі мела падтрымку і ад камандавання партызанскіх фарміраванняў Полацка-Лепельскай зоны. У пачатку красавіка 1943 г. па загадзе кіраўніка аператыўнай групы ў вёсцы Лесіны Ушачскага раёна шляхам аб'яднання падраздзялення «Мечыс» (камандзір П.П. Пранявічус), якое перамясцілася з Расонскага раёна, і байцоў, закінутых з Вялікай зямлі, былў створаны атрад «Жальгірыс». Пераход у напрамку літоўскай граніцы падраздзяленне ажыццяўляла ва ўзаемадзеянні з беларускім атрадам «Спартак» (камандзір А.М. Панамароў), які вяртаўся з Ушачскага раёна ў ранейшы рэгіён базіравання – казянскія лясы. Спрыянне беларускіх партызан дазволіла аператыўнай групе падрыхтаваць і правесці ў маі 1943 г. у вёсцы Зарубаўшчына Ушачскага раёна шырокую нараду з кіраўнікамі савецкага падполля Вільнюса, Каўнаса, Шаўляя, Алітуса, Панявежыса і іншых рэгіёнаў акупаванай Літвы. Мерапрыемства з удзелам каля 100 прадстаўнікоў рэспублікі мела важнае значэнне для далейшага пашырэння ўзброенай барацьбы супраць германскіх акупантаў на літоўскай зямлі. З мэтай канспірацыі аператыўная група перамяшчалася ў бок граніцы з Літвой асобнымі падраздзяленнямі і па розных маршрутах. Адно з падраздзяленняў у раёне ўрочышча Багна-Мох некалькі дзён базіравалася ў атрадзе «Кастрычнік», дзе папоўніла свае прадуктовыя запасы. На пасадачнай пляцоўцы атрада літоўскія партызаны прынялі самалёт з новымі байцамі для аператыўнай групы і груз са зброяй і боепрыпасамі. Своечасовая дапамога Цэнтра дазволіла беларускім і літоўскім партызанам сумесным ударам разграміць непадалёку размешчаны гарнізон праціўніка. Аператыўная група спачатку базіравалася ў казянскіх лясах, а потым у раёне возера Нарач, дзе пры ўдзеле мясцовых партызанскіх фарміраванняў разгарнула працу па павелічэнні колькаснага складу атрадаў і арганізацыі новых баявых адзінак. Так, у нарачанскай зоне на аснове падраздзялення «Жальгірыс» былі сфарміраваны партызанскія атрады «Вільнюс», «Гром», імя К. Каліноўскага. Асноўнай базай па падрыхтоўцы партыйных і камсамольскіх груп, партызанскіх падраздзяленняў для засылкі на тэрыторыю Літвы з'яўлялася беларуская брыгада імя К.Я. Варашылава (камандзір Ф.Р. Маркаў). Адным з першых прабіўся на тэрыторыю прыбалтыйскай рэспублікі і размясціўся ў паўднёвым рэгіёне атрад «Гром». У раёне Рудніцкай пушчы з ліпеня 1943 г. стала дзейнічаць партызанскае падраздзяленне на чале з намеснікам кіраўніка аператыўнай групы, сакратаром Паўднёвага абкама КП(б) Літвы Г.О. Зіманасам. Некалькі пазней у Рудніцкую пушчу прабраўся літоўскі атрад імя К. Каліноўскага, дзе правёў некалькі баявых аперацый сумесна з беларускім асобным партызанскім атрадам «Баец» (камандзір Д.К. Бацяноўскі) [1, с. 297, 312; 4, с. 362; 6, с. 478; 8, с. 319; 12, с. 609; 14, с. 103–104, 106; 23, с. 172–173].

Практычна адначасова з аператыўнай групай ЦК КП(б) Літвы і атрадам «Жальгірыс» па сваіх маршрутах перамяшчаліся з Мінскай вобласці на Вілейшчыну літоўскія партызанскія групы «Сябры» і «Нерыс» на чале з І.І. Вільджунасам. Перад маршам у пачатку вясны 1943 г. пад яго кіраўніцтвам на базе брыгады «Народныя мсціўцы» (камандзір В.Т. Варанянскі) была праведзена падрыхтоўка літоўскіх партызан да рэйду ў Літву. Для разгортвання эфектыўнай баявой дзейнасці ў тыле ворага літоўскія групы атрымалі з Цэнтра зброю, боепрыпасы, медыкаменты, а таксама радыёстанцыю. Падраздзяленні «Сябры» і «Нерыс» размясціліся ў нарачанскай зоне непадалёку ад атрада «Знішчальнік» (камандзір А.В. Жукаў) брыгады імя К.Я. Варашылава і пасля папаўнення мясцовымі патрыётамі перайшлі на тэрыторыю Літвы. Праз некаторы час І.І. Вільджунас, які застаўся з невялікай групай у нарачанскіх лясах, пры дапамозе партызан брыгады імя К.Я. Варашылава сфарміраваў з савецкіх патрыётаў навакольных вёсак новы партызанскі атрад [4, с. 361; 14, с. 99; 23, с. 181, 184–185].

Асноўнай базай размяшчэння літоўскіх партызан з чэрвеня 1943 г. і да ліпеня 1944 г. сталі казянскія і нарачанскія лясы, дзе знаходзіўся і Паўночны абкам КП(б) Літвы на чале з М.Ю. Шумаўскасам. Аб'ектамі сумесных удараў груп, атрадаў і брыгад Беларусі і Літвы ў рэгіёне былі чыгуначныя і шашэйныя камунікацыі і гарнізоны ворага. Падчас аперацыі «Рэйкавая вайна» беларускія брыгады імя М.Ф. Гастэлы, «Спартак» сумесна з літоўскімі партызанамі з брыгады «Жальгірыс», атрадаў «Вільнюс», імя К. Каліноўскага, «Маргерыс», «Бічуляй» праводзілі дыверсійныя аперацыі на лініях Вільнюс – Дзвінск, Вільнюс – Мінск, Дзвінск – Кёнігсберг, Вільнюс – Гродна. Агульнымі намаганнямі чыгуначная лінія Паставы – Варапаева

была выведзена з эксплуатацыі да прыходу ў рэгіён Чырвонай Арміі. Для больш эфектыўнай дыверсійнай дзейнасці на чыгунцы ажыццяўляўся ўзаемаабмен разведданымі, узаемадапамога ўзрыўчаткай, перадавымі метадамі падрыўной справы. Напрыклад, камандзір літоўскага атрада «Жальгірыс» Б. Урбанавічус па просьбе кіраўніцтва беларускіх брыгад «Спартак» і імя К.Я. Варашылава на працягу двух тыдняў падрыхтаваў для гэтых партызанскіх фарміраванняў каля 80 мінёраў. Мела працяг узаемадзеянне партызан пры правядзенні дыверсій на чыгунцы і ў 1944 г., асабліва падчас летняга наступлення Чырвонай Арміі [8, с. 319, 321; 12, с. 609, 616; 23, с. 174; 186].

Найбольш пашыраным відам сумесных дзеянняў беларускіх і літоўскіх партызан на тэрыторыі Вілейшчыны былі напады на апорныя пункты акупантаў. Ужо ў красавіку 1943 г. атрад «Кастрычнік» і літоўскія партызанскія падраздзяленні на чале з П. Пранявічусам і А. Зайцасам па загадзе БШПР разграмілі базу «народнікаў» у населеным пункце Лужкі за 20 кіламетраў на паўночны захад ад райцэнтра Пліса. Першай буйной сумеснай аперацыяй супраць гарнізонаў ворага быў налёт летам 1943 г. брыгады імя К.Я. Варашылава і літоўскага атрада «Вільнюс» на райцэнтр Мядзель. Падчас нападу партызаны захапілі вялікую колькасць зброі, харчоў і абмундзіравання. Нягледзячы на тое, што апорныя пункты ворага былі абнесены калючым дротам, мелі ўмацаваныя абарончыя кропкі і сістэму траншэй, беларускія і літоўскія партызаны рэгулярна наносілі ўдары па базах ворага, у тым ліку па нямецкіх гарнізонах на чыгунцы Вільнюс – Дзвінск. Некалькі баявых аперацый спатрэбілася правесці беларускім і літоўскім партызанам, каб разграміць гарнізон Шэметава, асабовы склад якога налічваў 150 чалавек. Толькі сабраўшы значныя сілы, атрады змаглі поўнасцю ліквідаваць апорны пункт праціўніка. Пра важнасць барацьбы з варожымі гарнізонамі ў дзейнасці партызан суседніх рэспублік сведчыць той факт, што за студзень – май 1944 г. беларускія брыгады «Спартак», імя К.Я. Варашылава, імя Ленінскага камсамола, асобны атрад «Баец» разам з літоўскімі партызанскімі фарміраваннямі «Жальгірыс», «Вільнюс», імя К. Каліноўскага, імя А. Міцкевіча, «Бічуляй» правялі больш за 30 буйных нападаў на гарнізоны акупантаў. Адзін з такіх удараў быў скіраваны па праціўніку ў райцэнтры Відзы. У выніку імклівых дзеянняў байцы з брыгады «Спартак», атрадаў «Жальгірыс» і імя К. Каліноўскага захапілі чатыры станковыя кулямёты, шмат аўтаматаў і вінтовак. Яшчэ раз акупацыйны гарнізон у гэтым райцэнтры быў атакаваны партызанамі суседніх рэспублік падчас аперацыі «Баграціён». У ноч з 28 на 29 чэрвеня 1944 г. байцы брыгады «Спартак» і літоўскіх атрадаў імя К. Каліноўскага і «Жальгірыс» пад агульным кіраўніцтвам сакратара Паўночнага падпольнага абкама КП(б) Літвы М.Ю. Шумаўскаса акружылі населены пункт і штурмам авалодалі Відзамі. Затым да падыходу часцей 6-й гвардзейскай арміі партызаны на працягу некалькіх дзён утрымлівалі райцэнтр, адбіваючы атакі германскіх войск [1, с. 311–312; 4, с. 363; 6, с. 478; 8, с. 321; 12, с. 616; 14, с. 106–107; 23, с. 174].

Маршруты перамяшчэння і месцы базіравання беларускіх і літоўскіх партызан на тэрыторыі Вілейшчыны неаднаразова былі аб’ектамі нападаў карных фарміраванняў акупантаў. Так, 11 мая 1943 г. брыгада імя К.Я. Варашылава і літоўскі атрад «Вільнюс» каля вёскі Антоны падчас передыслакацыі з казянскіх лясоў у Нарачанскую зону ўступілі ў сутыкненне з буйным фарміраваннем праціўніка, сабраным з ваеннаслужачых навакольных гарнізонаў. У выніку 9-гадзіннага бою пад кіраўніцтвам камбрыга Ф.Р. Маркава беларускія і літоўскія падраздзяленні падбілі два бронетранспарцёры, знішчылі дзясяткі акупантаў і не дазволілі праціўніку акружыць партызан. Яшчэ адзін бой на маршы адбыўся летам 1943 г. у Докшыцкім раёне, дзе партызанскі атрад аператыўнай групы ЦК КП(б) Літвы на чале з Г. Зіманасам разам з брыгадай імя ЦК КП(б)Б (камандзір А.Д. Мядзведзеў) адбілі нападзенне буйнога карнага атрада і нанеслі яму адчувальны ўрон. Канцэнтрацыю ў пачатку восені 1943 г. у Вілейскай вобласці значных сіл беларускіх і літоўскіх партызан гітлераўскае камандаванне разглядала як сур’ёзную пагрозу для сваіх аб’ектаў на тэрыторыі Літвы. З мэтай ліквідацыі небяспекі акупацыйны рэжым неаднаразова з восені 1943 г. і да лета 1944 г. накіроўваў карныя экспедыцыі ў месцы сумеснага базіравання партызанскіх фарміраванняў. Падчас правядзення найбуйнейшай з іх, пад кодавай назвай «Фрыц» (верасень – кастрычнік 1943 г.), праціўнік для акружэння беларускіх брыгад і атрадаў аператыўнай групы ЦК КП(б) Літвы ў раёне нарачанскіх і казянскіх лясоў прыцягнуў чатыры баявыя групы колькасцю да 20 тысяч карнікаў, 12 артбатарэй, 20 танкаў і 40 самалётаў. Некалькі тыдняў беларускія і літоўскія партызаны змагаліся з пераўзыходзячымі сіламі. Народныя мсціўцы пазбягалі адкрытых баёў і прарываліся ў тую мясцовасць Вілейшчыны, дзе было больш магчымасцей для манеўраў, а ў некаторых выпадках пераходзілі ў Віцебскую вобласць. У дні цяжкіх баёў дапамогу боепрыпасамі беларускім партызанам аказалі партызаны-літоўцы пад камандаваннем М.Ю. Шумаўскаса. У канцы кастрычніка – пачатку лістапада 1943 г. беларускія і літоўскія партызаны вярнуліся на ранейшыя месцы дыслакацыі ў казянскіх і нарачанскіх лясах і працягвалі да ліпеня 1944 г. сумесна праводзіць аперацыі на камунікацыях праціўніка, рабіць напады на яго гарнізоны як на тэрыторыі Вілейшчыны, так і Літвы. У нарачанскім рэгіёне, нягледзячы на пастаянныя напады карных войск, не спыняў сваю дзейнасць Паўночны падпольны абкам КП(б) Літвы, што мела важнае значэнне для далейшага пашырэння антыгерманскага супрацоўлення ў прыбалтыйскай рэспубліцы [4, с. 363; 7, с. 421–422; 8, с. 321; 14, с. 104; 23, с. 185–187].

У другой палове восені 1943 г. партызанскія зоны Віцебскай вобласці апынуліся ў прыфрантавой паласе. У такіх умовах германскае камандаванне стала шырока выкарыстоўваць рэгулярныя часці для барацьбы з партызанамі. Дзве маштабныя аперацыі былі разгорнуты акупантамі для ліквідацыі Расонска-

Асвейскай зоны. Пры правядзенні карнай экспедыцыі «Генрых» (31.10–9.11. 1943 г.) ворагу ўдалося рассекчы партызанскую зону з поўначы на поўдзень. Беларускія і калінінскія брыгады з усходняй часткі зоны пад націскам праціўніка з баямі адышлі да лініі фронту і злучыліся з наступаючымі войскамі 4-й ударнай арміі. Наступным ударам, падчас карнай акцыі «Ота» (20.12.1943–1.01. 1944 г.), гітлераўцы сіламі дзвюх дывізій да 24 снежня 1944 г. змаглі акружыць партызанскія фарміраванні ў заходняй частцы Расонска-Асвейскай зоны разам з дзясяткамі тысяч мірных жыхароў. У крытычнай сітуацыі па рашэнні нарады камандна-палітычнага складу быў прадпрыняты выхад з блакады дзвюма ўдарнымі групамі. Калона ў складзе Асвейскай і Дрысенскіх брыгад, ударнага батальёна Латвійскай брыгады пад агульным камандаваннем І.К. Захарава за двое сутак фарсіравала рэкі Нішча і Дрыса, перайшла шашу Клясціцы – Полацк і раніцай 30 снежня 1943 г. у раёне возера Страдань дасягнула баявых парадкаў Чырвонай Арміі. Разам з партызанамі ў савецкі тыл выйшла аператыўная група ЦК КП(б) Латвіі і 10 000 мясцовых жыхароў. З калоны калінінскіх партызан, маршрут якой адсачыла разведка немцаў, змаглі прарвацца на ўсходні бераг ракі Нішча і выйсці за лінію фронту толькі 11-я Калінінская брыгада і тры атрады. Партызаны і мірныя жыхары, якія не вырваліся з акружэння, пасля двух дзён баёў адышлі ў Маторынскія лясы. У сувязі з такой перадыслакацыяй партызанскіх сіл у канцы снежня 1943 г. спыніла сваю дзейнасць на тэрыторыі Асвейскага раёна аператыўная група ЦК КП(б) Латвіі, адыграўшы важную ролю ў разгортванні партызанскай барацьбы ў рэгіёнах прыбалтыйскай рэспублікі. У савецкім тыле аператыўная група ЦК КП(б) Латвіі злілася з Латвійскім штабам партызанскага руху [11, с. 177–178; 16, с. 275–288; 19, л. 201–202; 28, л. 114–115; 29, л. 54].

**Заключэнне.** Партызанскія зоны Віцебскай і Мінскай абласцей, казянскія і нарачанскія лясы Вілейшчыны сталі надзейнымі базамі для прыёму, арганізацыйнай і баявой падрыхтоўкі латышскіх і літоўскіх партызан на іх шляху з савецкага тылу да граніцы з прыбалтыйскімі рэспублікамі. Дзякуючы дапамозе органаў КП(б)Б і партызанскіх фарміраванняў, на беларускай тэрыторыі паспяхова разгарнулі работу па выкананні заданняў Цэнтра аператыўныя групы Цэнтральных камітэтаў КП(б) Латвіі і Літвы. За 1942–1943 гг. на тэрыторыі партызанскіх зон Беларусі дыслацыраваліся да 30 латышскіх і літоўскіх падраздзяленняў, якія ўмацаваліся арганізацыйна і набылі баявы вопыт падчас сумесных аперацый супраць гітлераўцаў. На тэрыторыі Асвейскага раёна была сфарміравана Латвійская брыгада. Яе арганізатарскія і баявыя групы вясной – восенню 1943 г. пранікалі ў розныя рэгіёны Латвіі, дзе ўсталёўвалі сувязі і аб'ядноўвалі ў атрады дробныя падпольныя і партызанскія адзінкі, ствралі новыя цэнтры барацьбы з акупантамі. У зоне казянскіх і нарачанскіх лясоў з літоўскіх атрадаў і груп арганізоўваліся партызанскія брыгады. Іх баявая дзейнасць ахоплівала тэрыторыю Беларусі і Літвы. У месцы базіравання літоўскіх і латышскіх партызанскіх фарміраванняў на тэрыторыі Беларусі пранікалі савецкія патрыёты з розных раёнаў прыбалтыйскіх рэспублік, каб уліцца ў шэрагі змагароў з фашыстамі. Можна сцвярджаць, што партызанскія зоны Беларусі адыгралі важную ролю ў пашырэнні антыгерманскага супраціўлення на тэрыторыі Прыбалтыкі.

## ЛІТАРАТУРА


1. Борьба за Советскую Прибалтику в Великой Отечественной войне. 1941–1945 : в 3 кн. – Рига : «Лиесма», 1966. – Кн. 1. – 368 с.
2. Борьба латышского народа в годы Великой Отечественной войны / Редкол.: А.А. Дризул (отв. ред), В.П. Самсон, В.И. Савченко. – Рига : «Зинатне», 1970. – 931 с.
3. В дни войны. (из истории Латвии периода Великой Отечеств. войны 1941–1945 гг.) : сб. ст. – Рига, 1964. – 296 с.
4. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны. В 3 т. – Минск : Беларусь, 1983–1985. – Т. 3. – 1985. – 531 с.
5. Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944): документы и материалы. В 3 т. – Минск : Беларусь, 1967–1982. – Т. 1: Зарождение и развитие партизанского движения в первый период войны (июнь 1941 – ноябрь 1942). – 1967. – 744 с.
6. Гісторыя Беларускай ССР. У 5 т. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972–1975. – Т. 4: Беларусь напярэдадні і ў гады Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза (1938–1945 гг.). – 1975. – 640 с.
7. Из истории партизанского движения в Белоруссии (1941–1944 гг.) : сб. воспом. – Минск : Госиздат БССР, 1961. – 506 с.
8. Климов, И. Партизаны Вилейщины / И. Климов, Н. Граков. – 2-е изд., доп. и перераб. – Минск : Беларусь, 1970. – 420 с.
9. Мацко, А. Боевое братство партизан / А. Мацко // Коммунист Белоруссии. – 1982. – № 9. – С. 46–53.
10. Рашкевиц, А.К. Народные мстители Латвии /А.К. Рашкевиц. – М. : Воениздат, 1973. – 146 с.
11. Самсон, В.П. Партизанское движение в Северной Латвии в годы Великой Отечественной войны / В.П. Самсон. – Рига : Латгосиздат, 1951. – 224 с.
12. Советские партизаны: из истории партизанского движения в годы Великой Отечеств. войны : сб. ст. / Ред.-сост. В.Е. Быстров. – 2-е испр. и доп. изд. – М. : Гослитиздат, 1963. – 799 с.
13. Титов, А. Боевое интернациональное братство / А. Титов // Коммунист Белоруссии. – 1974. – № 3. – С. 45–52.
14. Хацкевич, А.Ф., Крючок, Р.Р. Становление партизанского движения в Белоруссии и дружба народов СССР / А.Ф. Хацкевич, Р.Р. Крючок. – Минск : Наука и техника, 1980. – 320 с.
15. Филимонов, А.А. В едином боевом строю: о совместных действиях русских, белорусских, украинских, литовских, латышских, молдавских партизан / А.А. Филимонов, А.Д. Титов, Н.И. Эполетов // Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т ист. Беларуси ; ред. А.М. Литвин. – Минск, 2005. – 126 с.

16. Захаров, И.К. Война в краю озер. – 2-е перераб. и доп. изд. – Минск : Беларусь, 1973. – 319 с.
17. Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 – июль 1944) : краткие сведения / Манаенков А.Л [и др.]. – Минск : Беларусь, 1983. – 765 с.
18. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 68
19. НАРБ – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 36.
20. НАРБ – Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 523.
21. НАРБ – Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 180.
22. НАРБ – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 72.
23. Люди нарочанского края: воспоминания участников революционной борьбы и Великой Отечественной войны. – Минск : Беларусь, 1975. – 592 с.
24. НАРБ – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 76.
25. НАРБ – Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 263.
26. НАРБ – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 73.
27. НАРБ – Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 177.
28. НАРБ – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 31.
29. НАРБ – Ф. 1450. Воп. 4. Спр. 33.

*Паступіў 01.06.2020*

## PARTISAN ZONES OF BELARUS AS A SPRINGBOARD FOR THE DEPLOYMENT OF ARMED ANTI-GERMAN RESISTANCE IN LATVIA AND LITHUANIA (1941–1944): ORGANIZATIONAL AND COMBAT ASPECTS

***A. KRYVAROT***

*The issue of deploying a partisan movement on the Belarusian-Latvian and Belarusian-Lithuanian borders was examined. It is noted that the development of anti-German resistance in 1941-1944 on the territory of the Baltic republics was largely determined by the state of partisan forces in the North of the Vitebsk and Northern West of the Vileika regions. The role of the Vitebsk "gates", the Rosson-Osveisk, Surazh, Borisov-Begoml and Ushach partisan zones in the reception, functional training and material and technical support of detachments and battle groups sent from the Soviet rear for further combat activities in Lithuania and Latvia is disclosed. The locations of the operational groups of the Central Committee of the Communist Party of Latvia (b) and the Central Committee of the Communist Party (b) of Lithuania, the main areas of deployment of the Latvian and Lithuanian partisan units are designated. Examples of joint hostilities of the partisans of Belarus, Latvia and Lithuania on the enemy's transport communications and against his garrisons are given. The material was prepared on the basis of the analysis of scientific literature and documents of the National Archives of the Republic of Belarus.*

***Keywords:*** *task force, garrison, sabotage, kommunikatsii, punitive operation, partisan zone, partisan detachment, bridgehead, raid.*